# *СУСТРЭЧА 10*
# *ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ*

---

«Асноўнай мэтай Equipes Notre-Dame з’яўляецца дапамога сужэнствам у імкненні да святасці. Ні больш, ні менш».

кс. Анры Кафарэль

---

**1. Уводзіны**

На працягу гэтага года мы супольна прайшлі шлях спазнання харызмы Руху Equipes Notre-Dame. Мы ведаем, у чым заключаецца жыццё суполкі, мы пераасэнсавалі наша сужэнскае і сямейнае жыццё, мы ведаем магчымасці ўзаемадапамогі сужэнстваў з суполкі на сустрэчах і па-за сустрэчамі. Нас злучае прагненне жыць Евангеллем кожны дзень. Высілкі, якія мы прыкладаем – гэта імкненне ісці за Хрыстом. Мы спазналі радасць ад сустрэчы сяброў. Будзем старацца перажываць гэтую сустрэчу як абавязак «Сядзем разам», але не ў сужэнстве, а ў суполцы.

**2. Сустрэча суполкі**

## *І ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*




***Супольны пасілак і дзяленне жыццём***

Мы не ўяўляем сабе сустрэчы без гэтай часткі. Для сужэнства, якое прымае суполку дома, гэта магчымасць прыняцця дарагіх гасцей. Дзяленне жыццём дапамагае нам інакш, шырэй паглядзець на нашы радасці, турботы і клопаты.

## *ІІ ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*




***Малітва супольнасці***

Запаленая свечка дазваляе нам адчуць прысутнасць Хрыста. За Ім мы імкнемся і Яго шукаем, давяраючы, што Ён прывядзе нас да Айца. У малітве мы папросім Святога Духа аб дапамозе, каб мы не абапіраліся толькі на чалавечую мудрасць.

**Рым 12, 9 - 3**

---

Любоў няхай будзе некрывадушнай. Майце агіду да зла, гарніцеся да дабра; любіце адзін аднаго братняю любоўю, апярэджвайце адзін аднаго ў ветлівасці, у руплівасці будзьце нястомныя, духам палымнейце, служыце Пану. Цешцеся надзеяй, ва ўціску будзьце цярплівыя, у малітве – трывалыя; падтрымлівайце святых; дбайце пра гасціннасць.

---

# *III ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*

***Духоўнае жыццё. Паглыбленне веры і любові***

*Дзяленне рэалізацыяй канкрэтных пунктаў высілку*

Паколькі гэта сустрэча падвядзення вынікаў, гэта частка будзе мець іншы характар. Яна вельмі важная для суполкі. Вы павінны адважыцца на размову аб сабе. У духу праўды, у духу ўважлівага слухання і павагі да іншага чалавека. З прыняццем адрозненняў, якія ёсць паміж вамі, і з прыняццем індывідуальнага тэмпу праходжання чарговых этапаў дарогі. У духу малітвы, якая папярэднічае гэтай частцы сустрэчы.

## *Тэкст да абмену думкамі*

### Педагогіка Руху

Рух узнік, дзякуючы жыццёваму і рэлігійнаму вопыту сужэнстваў, якія хацелі жыць сакрамэнтам хросту і ў святле Евангелля. З кожным разам яны пачыналі лепей разумець патрабаванні хрысціянскага жыцця. Каб адказаць на іх, яны спрабавалі рэалізаваць некалькі практык, якія патрабавалі высілкаў з іх боку. Яны здаваліся ім ключавымі ва ўмацаванні іх з’яднання з Хрыстом. Сужэнцы таксама стараліся сказаць «так» Хрысту і яго выклікам. Можна сказаць, што гэта больш сучасны і адначасова супольны метад прыняцця пастановаў!

Сужэнствы, якія носяць у сабе вялікае прагненне ісці – разам з Хрыстом – да Айца, далучаюцца да суполак END. Рух мае заданне падтрымліваць іх на гэтай дарозе. Рух з’яўляецца духоўным выхавацелем сваіх удзельнікаў. Усё, што прапануе Рух, складае гэтае выхаванне: Карта, канкрэтныя пункты высілку, арганізацыя, жыццё суполкі, штомесячныя сустрэчы, але таксама тэмы года, рэкалекцыі, пілігрымкі…

Тут варта падкрэсліць важную ролю Пілатуючай пары, якая прысутнічае на першых сустрэчах новай суполкі, але таксама і Сувязной пары. Іх роля заключаецца ў тым, каб браць пад увагу асаблівыя сітуацыі/выпадкі, а таксама ахоўваць суполку ад залішняй фантазіі, ці прымянення занадта суровай дысцыпліны без добрага досведу.

Узаемная братэрская дапамога, ад пачатку, лічылася асноўным чыннікам нашай педагогікі.

Ад пачатку удзельнікі суполак імкнуліся да поспеху ў сферы любові і жыцця такой таямніцай, якую называюць «ecclesia». Яна з’яўляецца малой хрысціянскай супольнасцю, у ёй нараджаецца і абнаўляецца таямніца вялікага Касцёла. Удзельнікі суполак практыкавалі таксама духоўную дапамогу – у сапраўднай любові, ва ўсіх сферах: паміж сужэнцамі, сужэнствамі, суполкамі.

Толькі удзельнікі радасных суполак, дынамічных у веры, гасцінных, а таксама радасных Божых дзяцей могуць супрацьстаяць выклікам сучаснага свету (як сведкі Божай свабоды і маладосці ў Пану).

*Ліст END – Сродкі педагогікі*

- ## *Абмен думкамі на сустрэчы*

Вельмі важна, каб кожны асабіста і кожнае сужэнства, рыхтуючыся да сустрэчы, здзейснілі агляд зробленых высілкаў і ўбачылі іх плён. Варта назваць прычыны таго, што не атрымалася. Найлепш задаць сабе некалькі істотных пытанняў на тэму таго, што мы пераджылі за гэты год. Супольна пашукаць адказы падчас абавязку «Сядзем разам». Магчыма, больш, чым адзін раз у гэтым месяцы.

Сужанствы, якія праходзілі пілатаж, паразмаўляйце паміж сабой аб вашым рашэнні ўступіць ў Рух. Сужанствы, якія ўжо належаць да Суполак Маці Божай, пацвердзіце сваё рашэнне заставацца ў Руху.

- Ці мы ацэньваем Рух як месца, якое адпавядае нашым чаканням? Незалежна ад таго, пазітыўны ці негатыўны наш адказ, абгрунтуем наша меркаванне.
- Як мы ставімся да таго, што нам было прадстаўлена ў тэмах: педагогіка, ход сустрэчаў, пункты высілкаў?
- Што мы думаем аб супольным жыцці нашай суполкі на сустрэчах і па-за сустрэчамі?
- Ці ўдзел у сустрэчах наблізіў нас адно да аднаго і да Бога?
- Ці можам мы сказаць, што ідзем, каб сустрэць Хрыста?
- Чаго нам не хапіла ў гэтым фармацыйным годзе?

**Будзьце шчырыя і праўдзівыя ў сваіх адказах. Не абмяжоўвайцеся агульнымі фразамі.**

***МАГНІФІКАТ***

***БЛАГАСЛАЎЛЕННЕ НА ЧАС АДПАЧЫНКУ***